Многие задания, связанные с необходимостью мотивировать учебно-речевые действия, носят устно-речевой характер. Однако значительная часть упражнений посвящена непосредственной работе с текстами по специальности в области культуры и искусства.

Кроме познавательной, эстетической, лингвокультурологической составляющей, работа с текстами по специальности должна содержать аналитическую часть. Притекстовые, предтекстовые и послетекстовые упражнения обычно направлены на анализ семантики терминов, использованных в тексте, анализ его содержания и композиции, рефлексию над развитием темы, извлечение информации с той или иной степенью полноты. В качестве заданий на отработку продуцирования речи можно использовать составление различных видов плана, диалоги-беседы и диалоги-дискуссии, пересказ (устный и письменный), а также создание собственного текста по аналогии с имеющимся.

Целевая установка, стоящая перед обучаемыми при чтении научной литературы по специальности, – формирование и развитие технологической компетенции. Технологическая компетенция рассматривается как осознанное владение некоторой системой специальных знаний, формируемых в процессе обучения определенной профессии, а также способность оперировать приобретенными знаниями и умениями при выполнении коммуникативных заданий, обеспечивающих профессиональное общение. Специалист, владеющий технологической компетенцией, должен: а) понимать речь; б) уметь построить предложение из специальных слов и словосочетаний; в) уметь создать собственное связное высказывание на русском языке.

Таким образом, можно сказать, что профессионально-коммуникативная компетенция считается сформированной, если студенты создают свои высказывания на основе изученного грамматического и лексического материала, свободно владея всем языковым инструментарием, что и является показателем результативности обучения.

### Библиографический список


1. Щукин, А. Н. Методика преподавания русского языка как иностранного: учебное пособие / А. Н. Щукин [Текст]. – М. : ФЛИНТА: Наука, 2017. – 512 с.
2. Хуторской, А. В. Технология конструирования компетентностного обучения / А. В. Хуторской. [Электронный ресурс] // Вестник Института образования человека. – 2011 – № 2. – Режим доступа: http://eidos-institute.ru/upload/journal/2011/Eidos-Vestnik2011-211-Khutorskoy.pdf. –Дата доступа 13.09.2023.


# ПРАБЛЕМА БАЦЬКОЎ І ДЗЯЦЕЙ У АПАВЯДАННІ М. ЗАРЭЦКАГА “ДВОЕ ЖВІРОЎСКІХ": СПЕЦЫФІКА ВЫРАШЭННЯ


***К. Г. Шыдук (Мінск, Беларусь)***


Праблема бацькоў і дзяцей – адно з вечных пытанняў, якое ўздымаецца пісьменнікамі розных народаў і эпох. Даследаванню гэтай праблемы прысвечаны шматлікія творы беларускага слоўнага мастацтва: аповесць “Нізіны” Э. Ажэшкі, апавяданні “На Каляды к сыну” З. Бядулі, “Дзяльба кабанчыка” В. Карамазава, аповесць “Споведзь сына” У. Ліпскага… Не абмінуў яе выдатны айчынны празаік М. Зарэцкі ў апавяданні “Двое Жвіроўскіх” (1926). Праблема бацькоў і дзяцей тут вырашаецца на фоне іншай, ключавой у творчасці М. Зарэцкага, – барацьбы старога і новага, існавання ў паслярэвалюцыйных рэаліях “былых”, “учарашніх” [1, с. 507], як трапна ахарактарызаваў прадстаўнікоў старога ладу М. Мушынскі.

Натуральнае жаданне чалавека пражыць жыццё, як ён хоча, не заўсёды рэалізуецца. Так здарылася і з героем М. Зарэцкага, прыналежнага да свету “ўчарашніх”: лёс Жвіроўскага-ба-

цькі змяніла рэвалюцыя. Пісьменнік-маладняковец горача падтрымліваў ідэю пераўтварэнняў, таму ён намаляваў такі патрэт "учарашняга" героя, што выклікаў бы негатыўнае стаўленне: "У Жвіроўскага-бацькі нос высах ад ранняе старасці, і на твары, шызым ад куца падстрыжанай шэрсці, ён выдаецца навіслым карчом, пераплеценым сінімі жылкамі-пруццем. На самым канцы заўсёды трасецца бліскучая кропля" [2, с. 305].

Стары Жвіроўскі жыў успамінамі пра ранейшае жыццё, калі ў яго было ўсё: жонка – добрая гаспадыня, павага суседзяў, любімая праца, статус… Але ў адзін момант усё змянілася, рэвалюцыя забрала і жонку, і працу – застаўся толькі сын. Жвіроўскаму нават здавалася, што не было таго шчасця: "А мо і не было гэтага? Мо гэта старчыя сны толькі турбуюць нутро малюнкамі пекнымі? Памяць у Жвіроўскага-бацькі ўжо высыхае, памяць дрэнна ўжо служыць" [2, с. 306]. М. Зарэцкі стварыў праўдападобны і псіхалагічна дакладны вобраз старога, перадаў яго перажыванні настолькі пераканаўча, што ў нейкі момант герой пачынае выклікасць спачуванне. Як сапраўдны бацька, Жвіроўскі хваляваўся за свайго сына, з трывогай думаў пра яго будучыню, перажываў, ці знойдзе малы сваё месца ў вірлівым свеце. Сам не прымаючы паслярэвалюцыйных змен, ён баяўся, што яны нічога добрага не прынясуць сыну, і вызначыў для яго несуцяшальную перспектыву: хлопчык або загіне, або пойдзе на "нядобры шлях". "Нядобрым шляхам" Жвіроўскі лічыў тое, што сын можа ўключыцца ў новае грамадства, чужое і варожае для "ўчарашніх" ("О, гэта будзе самае горшае" [2, с. 312]). "Знаў, адчуваў сваім хваравітым інстынктам бацька Жвіроўскі, што калі-нікалі, а ўсё роўна ўбачыць ён у сыне сваім гэта страшнае, новае, чаго так баіцца ўбачыць. Знаў і дрыжаў і нецярпліва, настойна шукаў якога выйсця, шукаў спосабу ратаваць свайго сына" [2, с. 313].

Жвіроўскі-сын жыў пад татальным кантролем бацькі, не меў магчымасці нават пагуляць пасля школы з аднакласнікамі, а яму вельмі хацелася хаця б на хвілінку стаць паўнавартасным членам дзіцячай грамады. За такія думкі маломy часта станавілася сорамна перад бацькам: "І нецярпліва чакае, ахмелены тлумам, збянтэжаны роілам думак напружаных, каб хутчэй скончыліся заняткі, каб не было ўжо ні тлуму таго, ні звону дзіцячага, каб пабегчы, сціснуўшы сэрца, да бацькі і стуліцца ў норцы сваёй, забыцца на ўсё, толькі ўцішку, непрыметна для ўсіх пацяшаць сябе глыбока нязбытнымі марамі" [2, с. 311]. Неўзабаве ў падлетка з'явілася мара пра чырвоны гальштук, ён захацеў стаць піянерам – перадавым прадстаўніком новага свету. Аднак ведаў, што гэта не спадабаецца бацьку: "Толькі баяўся, не важыўся сказаць аб ёй бацьку, хаваў яе ў самым глыбокім кутку істоты свае, бярог, як патаемную нейкую схову" [2, с. 312].

Бацька знешне стрымана і спакойна адрэагаваў на хлопцавы словы пра намер стаць піянерам. Ён нават не запярэчыў. "У гэты момант, можа, больш, як калі, Жвіроўскі пачуў свайго бацьку. Яго сэрца растапілася жаркай пяшчотай, хацелася ў гэты час прыгалубіць старога бацьку, пацалаваць у шызы, аброслы падстрыжанай шэрсцю, зморшчаны твар" [2, с. 315]. Як выявіцца, стары прыдумаў выйсце, каб "выратаваць" сына ад жыцця: навучыць яго быць "падвойным". Ён не быў супраць, каб малы насіў чырвоны гальштук, але настройваў хлопца, каб той не прымаў новыя ідэалы і каштоўнасці, а толькі рабіў выгляд, прыкідваўся.

Бацька, здаецца, змірыўся з сынавым выбарам. Можа, усё б і далей было больш-менш спакойна, каб аднойчы школьнік не прынёс новыя кніжкі – у іх стары Жвіроўскі ўбачыў нешта чужароднае. Стары прыняў рашэнне спаліць кнігі, што стала кропкай разладу паміж блізкімі людзьмі: у маленькім сэрцы стаілася крыўда, а ў душы старога – злосць. Пасля гэтага Жвіроўскі ператварыўся ў мучыцеля – дома сына чакалі толькі здзекі. "Ішоў і знаў, што зараз бацька зашчэпіць дзверы, возьме хлудзіну якую і пачне біць. Біць будзе доўга, бо сын не хоча плакаць, а сцісне зубы ад болю і маўчыць. Будзе біць, пакуль усё-такі сын не заплача. А сын заплача не ад болю, боль ён можа стрымаць, – заплача ад злосці бяссільнай, ад таго, што сілы няма, што не зробіш нічога" [2, с. 319]. Кожны дзень стары з асаблівай жорсткасцю біў хлопца, нібы вымяшчаў на ім уласную крыўду, помсціў за свае няшчасці. Урэшце адносіны дайшлі да апошняй мяжы – стары ўвогуле выгнаў малога: "Ён кінуўся да сына, схапіў сваімі

касцянымі пальцамі сына за вуха, вывеў моўчкі з хаты і з усёй сілы штурхнуў за вароты. Сам вярнуўся ў хату, зашчапіў дзверы і сеў зноў на ложку – чорны, страшны, як нейкая дзікая крывяжэрная птушка” [2, с. 320].

Жыццёвыя шляхі блізкіх людзей разышліся. Ці прынясе ім гэта шчасце і душэўны спакой? Думаецца, не: бацька прагнаў самага роднага чалавека і застаўся зусім адзін, сын атрымаў свабоду і магчымасць будаваць сваё жыццё так, як ён хоча, аднак страціў сям’ю. Так ці інакш родныя людзі зрабіліся ворагамі. М. Зарэцкаму ўдалося паказаць драму старога і малога Жвіроўскіх, раскрыць вечную праблему бацькоў і дзяцей на сучасным яму грамадскім фоне, паказаць немагчымасць існавання прадстаўнікоў старога свету ў новую эпоху.

### Бібліяграфічны спіс

1. Мушынскі, М. І. Міхась Зарэцкі / М. І. Мушынскі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015 – Т. 2 : 1921–1941. – 2002. – С. 504–548.
2. Зарэцкі, М. Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1989–1992. – Т. 1 : Апавяданні ; прадм. М. Мушынскага. – 1989. – 526 с.